Немцы добывали ценные сведения о движении судов по Суэцкому каналу. Однако им так и не удалось воплотить в жизнь свою мечту: добиться прохода для немецких подводных лодок через Босфор. 2 августа 1944 г. Турция официально разорвала дипотношения с Германией. Не так давно у берегов Турции были обнаружены затопленные немецкие подводные лодки времен Второй мировой войны. Как сообщали турецкие средства информации, эти шесть субмарин были затоплены в 1944 г. по приказу нацистского командования. Турецким исследователям удалось обнаружить корпуса субмарин на расстоянии 3–5 км от берегов к северу от Стамбула, обе лодки прекрасно сохранись. В связи с запретом прохода немецких кораблей через Босфор и Дарданеллы эти лодки попали в Черное море по суше. Их сначала доставили в Румынию по частям, откуда уже собранными по реке Дунай они вышли в Черное море. После выхода Румынии из гитлеровской коалиции субмарины оказались заблокированными в море. Капитаны получили приказ о затоплении кораблей, а экипажам было приказано возвращаться в Германию по суше. Немцы не могли перевести свои подводные лодки из Средиземного моря через проливы Босфор и Дарданеллы. Турция придерживалась нейтралитета в ходе Второй мировой войны. Германия была вынуждена перебрасывать их через всю Европу. Операция была весьма трудоемкой. Лодки переправляли на гигантских платформах. Для уменьшения веса с них при отправке сняли двигатели, торпеды, другое крупногабаритное оборудование, а потом поставили обратно.

Для большинства современных турок Вторая мировая война до сих пор остается БЕЛЫМ пятном в истории. В учебниках для университетов военным действиям посвящено всего несколько страниц, а в школьных книгах и – того меньше. Многие турки с трудом могут ответить на вопрос о том, кто с кем и когда воевал, и уж тем более затрудняются сказать, сколько человек погибло.

**Список цитированных источников и литературы**

1. Документы внешней политики. – М., 1992. – Т. 2, Кн. 5.
2. Майский, И.М. Воспоминания советского дипломата. 1925–1945 / И.М. Майский. – М., 1987.
3. Судоплатов, П.А. Разные дни тайной войны и дипломатии / П.А. Судоплатов. – М., 2001.
4. Папен, Ф. Вице-канцлер Третьего рейха. Воспоминания политического деятеля гитлеровской Германии. 1933–1947 / Ф. Папен. – М., 2005.

## УПЛЫЎ КРЭДЫТНАГА ФАКТАРУ НА ПАЛІТЫКУ СССР ПА ГЕРМАНСКАМУ ПЫТАННЮ НА ПРАЦЯГУ 1990 г.

*Кавяка І.І.*
УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка», г. Мінск

У 1990 г германскае пытанне апынулася ў цэнтры міжнароднай палітыкі. Задачу канчатковага пасляваеннага ўрэгулявання ў адносінах да Германіі, акрамя ўласна ФРГ і ГДР, павінны былі вырашаць чатыры краіны, якія неслі адказнасць за Германію пасля Другой сусветнай вайны – ЗША, Вялікабрытанія, Францыя і СССР. Дзяржавы «чацвёркі» неаднолькава паставіліся да факту адкрыцця Берлінскай сцяны 9–10 лістапада 1989 г., розныя пазіцыі яны займалі таксама і па пытаннях тэрміну і формы рэалізацыі германскага адзінства. Калі краіны Захаду ў асноўным падзялялі пункт

погляду ФРГ на асноўныя накірункі аб'яднальнага працэссу, то СССР як краіна іншага ваенна-палітычнага блоку і грамадскага ладу апынуўся ў найбольш цяжкім становішчы, будучы загадзя пазбаўлены сур'ёзных паплечнікаў. Яшчэ адной краінай сацыялістычнага лагеру, якая магла прымаць непасрэдны ўдзел у вырашэнні германскага пытання, была ГДР, але яе ўнутрыпалітычнае становішча і настроі, панаваўшыя у грамадстве, фактычна звялі да мінімуму ўплывовасць усходненямецкага кіраўніцтва на ход перамоў.

Напачатку Францыя, Вялікабрытанія і, асабліва, ЗША віталі падзенне сцяны як знак заканчэння халоднай вайны, як сімвал перамогі каштоўнасцей заходняй дэмакратыі над ідэямі сацыялізму. Кіраўніцтва СССР у першапачатковы перыяд аказалася ў разгубленасці, пазбаўленае пэўнай стратэгіі дзеянняў па германскаму пытанню. Фактар нечаканасці і выяўленая немагчымасць савецкага ўраду да хуткай выпрацоўкі аператыўнай праграмы па германскай праблеме паўплывалі пасля на прынящце савецкім бокам шэрагу непрадуманых і, як лічаць некаторыя гісторыкі і грамадскія дзеячы таго часу, нават шкодных для СССР рашэнняў па дадзенаму пытанню. Першапачаткова Савецкі Саюз нават не дапускаў думкі аб магчымасці аб'яднання ФРГ і ГДР. Зразумела, што ГДР – «фарпост сацыялізму ў Еўропе» – з'яўлялася важным стратэгічным партнёрам СССР, саюзнікам па АВД і СЭУ. Далучэнне ГДР да ФРГ азначала б сур'ёзнае геапалітычнае паражэнне СССР у Еўропе. Таму ў канцы 1989 г. М. С. Гарбачоў заклікаў сусветную супольнасць да ўліку тагачасных рэалій – існавання двух незалежных нямецкіх дзяржаў, якія на той момант належалі да супрацьлеглых грамадска-палітычных, ідэалагічных, эканамічных, ваенных структур і з'яўляліся членамі ААН. Аднак на працягу першай паловы 1990 г. пазіцыя савецкага кіраўніцтва па германскаму пытанню змянілася. Згода СССР з тым, што немцы самі могуць вызначыць часавыя рамкі і хуткасць аб'яднальнага працэсу, была дадзена 10 лютага 1990 г. на сустрэчы Г. Коля і М.С. Гарбачова ў Маскве [11, с. 143].

Пасля таго як у лютым 1990 г. савецкі лідэр прызнае магчымасць аб'яднання Германіі, галоўным пытаннем у справе германскага адзінства становіцца пытанне аб вызначэнні ваенна-палітычнага статуса будучай аб'яднанай дзяржавы, паколькі ФРГ і ГДР уваходзілі ў розныя блокі – НАТА і АВД адпаведна. Калі ЗША, Вялікабрытанія і Францыя аднагалосна выступалі за ўваход аб'яднанай Германіі ў склад НАТА, то СССР выступаў супраць такога варыянту. Нязгода савецкага кіраўніцтва на ўключэнне тэрыторыі ГДР у сферу атлантычнага уплыву была натуральнай і дыктавалася геапалітычнымі матывамі. Савецкі бок прапаноўвае шэраг альтэрнатыўных варыянтаў – нейтралізацыя Германіі, уключэнне яе адразу ў два блокі – АВД і НАТА, роспуск абодвух блокаў і стварэнне новых структур еўрапейскай бяспекі з улікам геапалітычных змен на кантыненце. Аднак ніводная з гэтых прапаноў не была сур'ёзна ўспрынята Захадам. Паводле Хельсінкскага Заключнага акту 1975 г. кожная дзяржава мае права на самастойнае вырашэнне пытання аб прыналежнасці да таго ці іншага ваенна-палітычнага блока. Акцэнтуючы ўвагу сусветнай супольнасці на дадзеным аспекце, ФРГ, ЗША, Вялікабрытанія і Францыя здолелі пераканаць СССР у непазбежнасці ўваходу аб'яднанай Германіі ў НАТА, паколькі ФРГ ужо належала да дадзенага блоку, а абсалютная большасць насельніцтва ГДР таксама выказвалася за далучэння іх тэрыторый да зоны ўплыву ЕЭС і НАТА. У такой сітуацыі савецкаму кіраўніцтву прыйшлося ў ліпені 1990 г. прызнаць за немцамі права свабоднага выбару свайго будучага ваенна-палітычнага статуса, што фактычна азначала згоду СССР на ўключэнне аб'яднанай Германіі ў склад НАТА. Вырашэнне пытання сілавымі

метадамі савецкі бок палічыў немэтазгодным. Па-першае, М. С. Гарбачоў быў перакананы, што сілавое умяшальніцтва Савецкага Саюза ў справы ГДР дэскрэдытуе ўсю палітыку перабудовы, па-другое, СССР разумеў, што гэта можа стаць прычынай канфлікту сусветнага маштабу, па-трэцяе, сур'ёзныя ўнутрыпалітычныя праблемы, з якімі сутыкнулася савецкая дзяржава ў 1990 г., не пакідалі дастаткова сіл і рэсурсаў для больш пільнага і прынцыповага стаўлення да германскай праблемы. Да ўнутрыпалітычных праблем СССР таго часу адносіліся, перш за ўсё, нацыянальнае пытанне і глыбокі ўсеабдымны эканамічны крызіс. ФРГ, валодаючы дэтальнай інфамацыяй аб становішчы СССР, умела выкарыстала цяжкасці савецкай дзяржавы пры вырашэнні германскага пытання.

Палітыка перабудовы, пачатая ў 1985 г. М.С. Гарбачовым і скіраваная на паступовы перанос некаторых ідэалаў і каштоўнасцей заходняй цывілізацыі на савецкую глебу, была цалкам падтрымана краінамі Захаду. Аднак да 1990 г. дадзены палітычны курс прывёў краіну да шэрагу цяжкасцей, у першую чаргу эканамічнага характару, якія паставілі пад пагрозу яго далейшую рэалізацыю. Паколькі дадзеная палітыка была візітнай карткай М.С. Гарбачова, то правал перабудовы азначаў бы і палітычнае банкруцтва для яе ідэолага і галоўнага праваднікa. Відавочна, што на працягу першай паловы 1990 г. краіны Захаду, і асабліва кіраўніцтва ФРГ, былі непасрэдна зацікаўлены ва ўмацаванні ўнутрыпалітычных пазіцый М.С. Гарбачова, паколькі толькі ў супрацоўніцтве з ім лічылі магчымым канчатковае вырашэнне германскага пытання. Магчымая змена кіраўніцтва СССР у дадзены перыяд магла б прывесці да нечаканага павароту ў германскай праблеме, а то і ўвогуле сарваць перамовы аб уз'яднанні Германіі, якія ў першай палове 1990 г. знаходзіліся ў поўным разгары. З мэтай прадухіліць эканамічны калапс СССР, а таксама схіліць савецкае кіраўніцтва да кампрамісу па пытанню ваенна-палітычнага статуса аб'яднанай Германіі, заходнегерманскі ўрад праводзіў у дадзены перыяд гнуткую палітыку перніка, скіраваную на ільготнае крэдытаванне савецкай эканомікі. Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца высвятленне ўплыву крэдытнага фактару савецка-германскіх адносін першай паловы 1990 г. на трансфармацыю пазіцыі савецкага кіраўніцтва па пытанню аб'яднання Германіі.

Ужо ў студзені 1990 г. СССР сутыкнуўся з вострым недахопам тавараў першай неабходнасці, у тым ліку прадуктаў харчавання. 8 студзеня 1990 г. савецкі пасол у ФРГ Ю.А. Квіцынскі перадаў канцлеру ФРГ Г. Колю просьбу савецкага кіраўніцтва аказаць СССР дапамогу ў забеспячэнні краіны мясам. Заходненямецкае кіраўніцтва палічыла магчымым арганізаваць пастаўку ў Савецкі Саюз звыш 120 тыс. тон мяса ў тэрмін ад чатырох да шасці тыдняў. Г. Коль быў упэўнены – чым хутчэй аказаць дапамогу СССР, тым большае ўражанне гэта зробіць на савецкія кіруючыя колы. Калі ж М.С. Гарбачова не падтрымаць, калі дапусціць зняцце яго з пасады Генеральнага сакратара ЦК КПСС, тады, на думку заходнегерманскага канцлера, аб уз'яднанні Германіі можна забыць [11, с. 101]. 24 студзеня 1990 г. кіраўніцва ФРГ прыняло рашэнне аб пастаўцы СССР па ільготнай цане 52 тыс. тон ялавічных кансерваў, 50 тыс. тон свініны, 20 тыс. тон сметанковага масла, 15 тыс. тон малочнага парашку і 5 тыс. тон сыру. Дзеля таго, каб кампенсаваць нямецкім аграрыям розніцу ў кошце ўрад ФРГ выдзеліў 220 млн. марак [11, с. 114]. У той жа дзень М. Партугалаў, спецыяліст па Германіі, супрацоўнік міжнароднага аддзелу ЦК КПСС у інтэрв'ю нямецкаму выданню «BILD-Zeitung» заявіў: «Калі народ ГДР хоча аб'яднання, то яно прыйдзе. Мы ніякім чынам не збіраемся ўмешвацца або выступаць супраць такога рашэння» [11, с. 114]. Афіцыйная згода савецкага кіраўніцтва на перадачу хуткаснага рухавіка аб'яднання ў рукі нямецкаму народу была дадзена на савецка-нямецкай сустрэчы ў Маскве 10 лютага 1990 г.

З гэтага часу асноўным спрэчным пытаннем па германскай праблеме становіцца пытанне будучага ваенна-палітычнага статуса аб'яднанай Германіі. Адначасова вясной 1990 г. ізноў пагаршаецца эканамічнае становішча СССР. Краіна адчувае вострую патрэбу ў замежных крэдытах і звяртаецца за дапамогай да таго, хто ўжо адклікаўся на просьбы савецкай дзяржавы ў крытычныя моманты студзеня 1990 г.

14 мая 1990 г. адбыўся візіт дэлегацыі ФРГ у Маскву і перамовы яе членаў з М.С. Гарбачовым, Э.А. Шэварнадзэ, М.І. Рыжковым, Ю.А. Квіцынскім, С.А. Сітаранам. Дарадчык канцлера ФРГ па знешнепалітычных пытаннях Х. Тэльчык, які ўзначальваў дэлегацыю ФРГ, прыводзіць наступныя словы старшыні савецкага ўраду М. І. Рыжкова ад 14 мая 1990 г.: «Ад палітыкі перабудовы залежыць лёс усяго свету. Дапамога для СССР з'яўляецца дапамогай для ўсіх» [11, с. 231]. М.І. Рыжкоў звярнуўся да прадстаўнікоў нямецкай дэлегацыі з канкрэтнымі просьбамі: Савецкаму Саюзу патрэбны тэрміновы крэдыт у памеры 1,5–2 млрд. рублёў, каб умацаваць плацёжаздольнасць краіны; акрамя гэтага, савецкае кіраўніцтва разлічвае да атрыманне ад ФРГ доўгатэрміновага крэдыту ў памеры 15–20 млрд. рублёў. На момант перамоў курс савецкага рубля да заходненямецкай маркі складаў 1:1. Як патлумачыў М.С. Гарбачоў падчас размовы з Х. Тэльчыкам 14 мая 1990 г., раней цэнтр цяжару савецкай эканомікі прыходзіўся на цяжкую прамысловасць і абарончы сектар, «зараз жа мы разварочваем яго ў бок вырашэння сацыяльных пытанняў, вытворчасці тавараў масавага спажывання. Натуральна, што ўсё гэта мы хочам зрабіць з найменшай рызыкай. А дзеля гэтага нам патрэбны страховачныя меры, свайго роду страхавы фонд. Пад ім мы маем на ўвазе льготны крэдыт ад нашых заходніх партнёраў» [2, с. 2].

У дадзеных перамовах прымалі ўдзел таксама старшыні кіраванняў Дрэздэнскага банку В. Роллер і Нямецкага банку Х. Коппер. Падчас размовы са старшынёй Дзяржаўнай знешнеэканамічнай камісіі Савета міністраў СССР С. А. Сітаранам яны высветлілі інфармацыю аб знешняй запазычанасці СССР на той момант: 6 млрд. рублёў складала запазычанасць перад ФРГ; 5,2 млрд. – перад Японіяй, 4,3 млрд. – перад Італіяй; 3,1 млрд. – перад Францыяй; 2,6 млрд. – перад Аўстрыяй і 1, 5 млрд. – перад Вялікабрытаніяй [11, с. 232].

Х. Тэльчык звярнуў увагу савецкага кіраўніцтва на тое, што ў ФРГ фінансавая падтрымка СССР будзе разглядацца толькі ў рамках агульнага пакету савецка-нямецкіх пытанняў, у тым ліку пытання аб уз'яднанні Германіі. Аднак на той момант М.С. Гарбачоў лічыў найлепшым спосабам вырашэння праблемы роспуск блокаў АВД і НАТА і стварэнне новых структур еўрапейскай бяспекі [2, с. 7]. Такая пазіцыя кіруючых колаў СССР і была выкладзена Х. Тэльчыкам Г. Колю пасля вяртання ў Бонн.

15 мая 1990 г. адбылася размова паміж міністрам замежных спраў Вялікабрытаніі Д. Хэрдам і Г. Колем, у якой заходненямецкі канцлер выказаў думку, што СССР магчыма, саступіць па пытанню членства аб'яднанай Германіі ў НАТА, калі Захад задаволіць яго эканамічныя інтарэсы. М. С. Гарбачоў, на думку Г. Коля, «будзе старацца сыграць як мага найлепш, але ў выніку, улічваючы свае інтарэсы, пагадзіцца з нашай пазіцыяй» [4, с. 1120]. У размове двух палітыкаў не выключалася таксама магчымасць аказання палітычнага ціску на Савецкі Саюз па пытанню германскага адзінства.

17 мая 1990 г. адбылася размова паміж канцлерам ФРГ Г. Колем і прэзідэнтам ЗША Дж. Бушам. Г. Коль перадаў амерыканскаму лідэру інфармацыю аб цяжкім эканамічным становішчы СССР і выказаў думку, што падтрымка палітыкі рэформ М.С. Гарбачова адпавядала б інтарэсам усяго Захаду. Дж. Буш пагадзіўся з гэтым

сцверджаннем, аднак растлумачыў, што ў сувязі з падзеямі ў Літве і агульным настроем Кангрэсу ён «звязаны па руках і нагах» і не можа аказаць фінансавую дапамогу СССР [11, с. 237].

18 мая 1990 г. адбылася сустрэча М.С. Гарбачова з дзяржсакратаром ЗША Дж. Бэйкерам. Падчас размовы з прадстаўніком амерыканскага кіраўніцтва М.С. Гарбачоў папракнуў ЗША за недавер да аб'яднанай Германіі і імкненне «прывязаць» яе да НАТА, у той жа час савецкі лідэр ясна ўяўляў, што магчымасць уваходжання аб'яднанай Германіі ў склад АВД роўна нулю [1, с. 131]. Тым часам кіраўніцтва ФРГ інтэнсіўна распрацоўвала варыянты прадастаўлення крэдыту СССР. 22 мая 1990 г. канцлер Г. Коль у лісце да М.С. Гарбачова выказаў згоду на тэрміновае крэдытаванне савецкай эканомікі ў межах 5 млрд. марак. Аднак узамен Г. Коль чакаў ад савецкага кіраўніцтва ў рамках перамоў «2+4» ўсіх магчымых дзеянняў, якія б садзейнічалі канструктыўнаму вырашэнню злабадзённых пытанняў у сферы германскага адзінства яшчэ да канца 1990 г. Такім чынам, працягваў канцлер, шлях да падпісання ўсеагульнай дамовы аб супрацоўніцтве паміж СССР і аб'яднанай Германіяй аказаўся б адкрытым [8, с. 1136]. Пытанне аб доўгатэрміновым крэдыце для СССР Г. Коль лічыў неабходным першапачаткова абмеркаваць з 12 краінамі ЕЭС, у арганізацыі сустрэчы якіх пагаджаўся праявіць ініцыятыву [8, с. 1137].

29 мая 1990 г. падчас сустрэчы з супрацоўнікамі Рабочай групы па Германіі пры амерыканскім Кангрэсе Г. Коль яшчэ раз звярнуў увагу на сур'ёзныя эканамічныя праблемы СССР і патрэбу савецкага кіраўніцтва ў замежных крэдытах, якія могуць прадаставіць ЗША, Канада, Японія і Еўропа. ФРГ, у сілу асабістай зацікаўленасці ў найхутчэйшым вырашэнні германскага пытання, займала сярод патэнцыяльных крэдытораў найбольш актыўную пазіцыю. Г. Коль ужо тады не дапускаў думкі, што СССР можа сарваць перамовы па германскай праблеме з-за будучага магчымага членства аб'яднанай Германіі ў НАТА [7, с. 1156]. У гэты ж дзень міністр замежных спраў СССР Э.А. Шэварнадзэ ў газеце «Известия» паведаміў, што Захад сур'ёзна ставіцца да ўліку савецкіх інтарэсаў па пытаннях бяспекі. Такі пункт погляду Э.А. Шэварнадзэ абгрунтаваў падрыхтаванасцю НАТА да рэфармавання блоку ў палітычным і ваенным накірунках, а таксама да ўліку агульнаеўрапейскіх інтарэсаў бяспекі. Х. Тэльчык успрыняў дадзенае выступленне савецкага міністра замежных спраў як падрыхтоўку савецкага грамадства да магчымага ўваходу аб'яднанай Германіі ў склад НАТА [11, с. 252].

8 чэрвеня 1990 г. падчас візіту Г. Коля ў Вашынгтон і размовы з Дж. Бушам, амерыканскі прэзідэнт яшчэ раз абгрунтаваў немагчымасць аказання фінансавай дапамогі СССР з боку ЗША па прычыне літоўскага пытання, а таксама праблемай не выплачаных да таго часу ЗША запазычанасцей з боку царскай Расіі [6, с. 1194]. На наступны дзень, 9 чэрвеня, Г. Коль атрымаў ліст ад М.С. Гарбачова, у якім савецкі лідэр выказваў нямецкаму канцлеру падзяку за гатоўнасць аказаць эканамічную дапамогу СССР і выказваў упэўненасць у тым, што выпрацоўка агульнага кіраўніцтва знешнімі аспектамі аб'яднання Германіі можа быць дасягнута яшчэ да склікання саміту краін ЕЭС [10, с. 1199]. Варта адзначыць, што выпрацоўка агульнага кіраўніцтва знешнімі аспектамі аб'яднання Германіі не магла адбыцца без дасягнення дамовы паміж краінамі «чацвёркі» – ЗША, Вялікабрытаніяй, Францыяй і СССР – па пытанню будучага ваенна-палітычнага статуса ФРГ. Відавочна, што ЗША, Вялікабрытанія і Францыя не збіраліся адмаўляцца ад членства аб'яднанай Германіі ў НАТА, што цудоўна разумелі ў Маскве. Такім чынам, савецкае кіраўніцтва фактычна дало згоду на вырашэнне дадзенага пытання па прапанаванай Захадам схеме.

Пасля фактычнай згоды СССР у ліпені 1990 г. на ўваход аб'яднанай Германіі ў склад НАТА, кіраўніцтва ФРГ распрацавала ў жніўні яшчэ адну праграму пастаўкі прадуктаў харчавання ў Савецкі Саюз па ільготнай цане на агульную суму каля 1 млрд. марак [11, с. 355]. У верасні было вырашана паставіць СССР яшчэ 255 тыс. тон мяса і 60 тыс. тон сметанковага масла. На вывад савецкіх войск з тэрыторыі ГДР і іх размеркаванне ў СССР кіраўніцтва ФРГ выдзеліла 12 млрд. марак і дадаткова прадаставіла савецкай дзяржаве беспрацэнтны крэдыт у памеры 3 млрд. марак. Г. Коль спадзяваўся, што гэтыя меры будуць мець пазітыўнае ўздзеянне на падпісанне Дамовы аб канчатковым урэгуляванні ў адносінах да Германіі [11, с. 361], якое адбылося 12 верасня 1990 г. у Маскве і афіцыйна замацавала дамовы па германскаму пытаню, дасягнутыя ў ліпені таго ж года.

Такім чынам, крэдытны фактар адыграў важную ролю ў змене пазіцыі савецкага кіраўніцтва па германскаму пытанню на працягу лістапада 1989–ліпеня 1990 г. Кіраўніцтва ФРГ змагло ўмела выкарыстаць унутрыпалітычныя цяжкасці савецкай дзяржавы, у першую чаргу эканамічныя праблемы, для вырашэння пытання аб адзінстве Германіі. Разумеючы крытычнасць эканамічнага стану СССР, ФРГ своечасова прапанавала сваю дапамогу, якуя, яна ведала, не адхіляць. Дасягненнем заходнегерманскай дыпламатыі стала прывязка эканамічнай дапамогі савецкай дзяржаве з боку ФРГ да палітыкі СССР па германскаму пытанню. У выніку атрымалася, што не савецкае кіраўніцтва вырашала лёс будучай аб'яднанай Германіі, а ўрад ФРГ вырашаў лёс Савецкага Саюзу ў перыяды абвастрэння эканамічнага крызісу ў 1990 г., адначасова атрымоўваючы дывідэнды па германскай праблеме. Асабліва сур'ёзнай з'явілася саступка СССР па пытанню аб будучым ваенна-палітычным статусе аб'яднанай Германіі. Дадзеную саступку можна ўспрымаць як прыняцце аб'ектыўных палітычных рэалій таго часу альбо як вялікую памылку савецкага кіраўніцтва, якая аказалася лёсавызначальнай для савецкай дзяржавы. Увогуле варта адзначыць, што аб'яднанне Германіі прайшло на вельмі выгадных умовах для немцаў. У свой час К. Адэнаўэр і Ф.-Й. Штраус гатовы былі заплаціць за адзінства дзяржавы 300 млрд. марак, у сапраўднасці ж аб'яднанне абышлося ў 12 млрд. марак [11, с. 361]. Праўда, дадзеная лічба не ўключае тыя маштабныя фінансавыя ўліванні, якія ФРГ правяла ў землі ГДР пасля аб'яднання і працягвае праводзіць па сённяшні дзень. Праблема ўнутранага выраўнання аб'яднанай Германіі застаецца актуальнай і сёння.

З геапалітычнага пункту погляду аб'яднанне Германіі садзейнічала распаду СССР, Югаславіі, Чэхаславакіі, аслабленню геапалітычных пазіцый Францыі і Польшчы. Пасля аб'яднання ФРГ пераўтварылася ў адну з найбольш уплывовых дзяржаў ў Еўропе і звеце, заняла вядучыя пазіцыі ў міжнародных інстытутах і арганізацыях, такіх як НАТА, ЕС, МБРР, ЕБРР. Асабліва заўважна ўзрасла роль аб'яднанай Германіі ў рэгіёне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (ЦУЕ). Пасля 1990 г. ФРГ паступова фарміруе на тэрыторыі краін ЦУЕ геапалітычную зону з яскрава выражаным нямецкім уплывам, у першую чаргу эканамічнага характару. Разам з тым неадназначнымі застаюцца адносіны ФРГ з ЗША, асабліва па пытаннях знешняй палітыкі на Бліжнім Усходзе і ў Афганістане. У сферы еўрапейскай палітыкі ФРГ аддае перавагу супрацоўніцтву з Францыяй, разам з ёй рухаючы наперад палітычную інтэграцыю Еўропы, а разам з тым і паступова пашыраючы сферу свайго ўплыву на Усход і Паўднёвы Усход.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Горбачев, М. С. Как это было: Объединение Германии / М. С. Горбачев. – М.: Вагриус, 1999. – 238 с.

2. Из беседы М.С. Горбачева с Х. Тельчиком 14 мая 1990 года // Архив Горбачев-Фонда. – Фонд № 1. – Опись № 1 [Электронный источник]. – Код доступа: http://www.rodon.org/other/mgigv/1990_8.htm. - Время доступа: 30. 09. 2008
3. Delegationsgesprach des Bundeskanzlers Kohl mit Prasident Bush Washington, 17. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
4. Gesprach des Bundeskanzlers Kohl mit Außenminister Hurd Bonn, 15. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
5. Gesprach des Bundeskanzlers Kohl mit Ministerprasidentin Prunskiene Bonn, 11. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
6. Gesprach des Bundeskanzlers Kohl mit Prasident Bush Washington, 8. Juni 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
7. Gesprach des Bundeskanzlers Kohl mit Vertretern der Studiengruppen über Deutscland des amerikanischen Kongresses Bonn, 29. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
8. Schreiben des Bundeskanzlers Kohl an Prasident Gorbatschow Bonn, 22. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
9. Schreiben des Bundeskanzlers Kohl an Staatsprasident Mitterrand Bonn, 23. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
10. Schreiben des Prasident Gorbatschow an Bundeskanzler Kohl 9. Juni 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.
11. Teltschik, H. 329 Tage: Innenansichten der Einigung / Horst Teltschik. – Der Goldmann Verlag, 1993. – 381 s.
12. Vorlage des Ministerialdirektors Teltschik an Bundeskanzler Kohl. Bonn, 8. Mai 1990 Dokumente zur Deutschlandpolitik. Deutsche Einheit (Sonderedition aus den Akten des Bundeskanzleramtes 1989/90). – München, R. Oldenbourg Verlag, 1998. – 1667 s.

## ОСНОВНЫЕ ИДЕОЛОГЕМЫ СОВЕТСКОЙ ПРОПАГАНДЫ ПРЕДВОЕННОГО ВРЕМЕНИ.

***Ковалёва Н.Н.***
УО « Брестский государственный технический университет», г. Брест

Советское государство конца 20–30-х гг. XX в., когда оформился и укрепился авторитарно-тоталитарный режим, являло собой образец страны, где идеология не возникала стихийно, а формировалась и внедрялась в массы путём активной идеологической работы. Здесь действительно слово пропаганда (лат. propaganda (дословно) — «подлежащая распространению (вера)», от лат. propago – «распространяю») означало распространение идей, и идеология определяла пропаганду, в то время как в большинстве демократических государств уже возникли новые отношения между идеологией и пропагандой.